Вольга Какшынская

Галоўны бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі



Наталля Карнейчук

Вядучы бібліятэкар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі



# ЧАС ПАДВЕСЦІ ВЫНІКІ. ПЕРАМОЖЦЫ XXVI РЭСПУБЛІКАНСКАГА КОНКУРСУ «БІБЛІЯТЭКА – АСЯРОДАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ»: ЛЕПШЫЯ З ЛЕПШЫХ

Патэнцыял бібліятэк у справе адраджэння нацыянальнай спадчыны, гісторыі, літаратуры і мовы ўжо каторы год выразна адлюстроўвае прафесійны рэспубліканскі конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры». Адначасова конкурс прыцягвае ўвагу да бібліятэчнай прафесіі, падымае прэстыж бібліятэкараў, дае ім магчымасць праявіць свой талент.

15 мая 2018 г. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі падведзены вынікі XXVI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2017 г. У склад кампетэнтнага журы ўвайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк г. Мінска, грамадскага аб'яднання «Беларускі фонд культуры».

У рэспубліканскім этапе конкурсу прынялі ўдзел 38 работ, 23 з іх сталі пераможцамі ў 4 намінацыях: «За пошукавую і даследчую працу», «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За падтрымку і развіццё чытання», «За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы». Восем работ журы прадставіла да заахвочвання.

Пераможцы атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 95 ад 7 чэрвеня 2018 г. «Аб выніках XXVI Рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры"» – дыпломы першай, другой, трэцяй ступені і грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна. Бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання, атрымаюць грашовыя прэміі ў памеры 10 базавых велічынь.

Змястоўная насычанасць, шматгранныя і разнастайныя тэхнікі прадстаўлення работ выклікалі некаторыя цяжкасці журы ў вылучэнні пераможцаў конкурсу. Матэрыялы былі ацэнены па паўнаце раскрыцця тэмы, арыгінальнасці падачы матэрыялу, афармленні работы.

Паведамім пра асноўныя дасягненні бібліятэк-пераможцаў, якія адзначаны дыпломамі першай ступені ў кожнай з намінацый.

Найбольшая колькасць работ была прадстаўлена ў намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» – 11.

Першае месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Ф. Скарыны дзяржаўнай установы культуры «Полацкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Віцебскай вобласці за вялікую працу па вывучэнні гісторыі г. Полацка і ўвекавечанні памяці аб знакамітых дзеячах Полацкай зямлі. Карпатлівая праца бібліятэкараў увасоблена ў краязнаўчым інтэрнэт-праекце па гісторыі краю – базе даных «Памяць Полаччыны». База даных уключае больш за 7,5 тыс. тэкставых дакументаў, 85 відэафільмаў, больш за 100 фотадакументаў і рэпрадукцый твораў выяўленчага мастацтва, якія ўтрымліваюць спасылкі на вэб-рэсурсы. Матэрыял суправаджаецца архіўнымі і бібліяграфічнымі дакументамі, фотаздымкамі з фондаў Полацкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, з уласных архіваў краязнаўцаў, гісторыкаў, выкладчыкаў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта і школ горада, а таксама актыўных чытачоў бібліятэкі. У хуткім часе рэсурс будзе прадстаўлены на сайце бібліятэкі.

Лепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала Жыліцкая сельская бібліятэка-філіял дзяржаўнай установы культуры «Сетка бібліятэк Кіраўскага раёна» Магілёўскай вобласці. Супрацоўнікамі бібліятэкі складзены і прадстаўлены летапіс роднага сяла – краязнаўчы альбом «Жыліцкі версаль». У багата ілюстраваным, унікальным па сваім змесце і афармленні выданні адлюстравана амаль 200-летняя гісторыя палацава-паркавага ансамбля: яго пампезнае будаўніцтва, раскоша і багацце пры Булгаках, заняпад і спусташэнне пасля рэвалюцыйных і ваенных падзей, гады савецкай улады і адраджэнне ў апошнія дзесяцігоддзі. З розных крыніц па макулінках сабраны матэрыялы аб вядомых прадстаўніках роду Булгакаў, складзена іх радавое дрэва. Работа ўключае архіўныя дакументы, запісы сустрэч са старажыламі, успаміны, фотадакументы, копіі матэрыялаў з дзяржаўных і сямейных архіваў, музеяў, публікацыі з перыядычных выданняў.

У намінацыі **«За падтрымку і развіццё чытання»** бібліятэкамі было даслана 10 работ.

На першую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк журы вылучыла Гарадскую бібліятэку сямейнага чытання дзяржаўнай установы культуры «Светла-

горская раённая сетка бібліятэк» Гомельскай вобласці за шматгранную дзейнасць па далучэнні да чытання сем'яў праз выкарыстанне нестандартных форм папулярызацыі кнігі. Бібліятэка рэалізуе 12 творчых праектаў: інтэрнэт-праект «Прачытай услед за мной!», інфармацыйна-прафілактычны праект «Выбар на карысць жыцця», валанцёрскі праект «Казачкі.бай!», летні праект «Кніжныя дзеткі» і іншыя, у межах якіх арганізуюцца сямейныя выхадныя ў бібліятэцы, цыклы займальных медыяўрокаў, конкурсы чытачоў, турніры разумнікаў і разумніц, квест-гульні, інтэрактыўныя майстар-класы, Дні інтэлектуалаў і г. д. Вялікай папулярнасцю ў бібліятэцы карыстаецца куток беларускай кнігі, створаны ў межах брэнд-праекта «Кніжныя пярлінкі». Развіццю творчага кантакта з чытачамі, актыўнаму ўдзелу сем'яў у бібліятэчных праектах садзейнічаюць чатыры клубы па інтарэсах, якія аб'ядноўваюць звыш 100 дзяцей і дарослых.

Першае месца сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк заняла дзяржаўная ўстанова культуры «Лоеўская цэнтральная раённая бібліятэка» Гомельскай вобласці за набліжэнне кнігі да жыхароў маланаселеных пунктаў Лоеўскага раёна. Вялікай папулярнасцю сярод жыхароў Лоеўшчыны карыстаецца аўтабібліятэка. Бібліёбус пачаў дзейнічаць з 2011 г. і ў 2017 г. у бібліятэцы ўжо налічвалася 10 маршрутаў і 44 населеныя пункты абслугоўвання. Станоўчым вопытам працы бібліёбуса з'яўляецца пашырэнне меж абслугоўвання. Ён наведвае малочна-таварныя фермы, машынна-трактарныя паркі гаспадарак, прадпрыемствы, магазіны. Для зручнасці карыстальнікаў прадугледжаны сэрвіс «Кніга пад заказ». У рамках работы аўтабібліятэкі вядзецца праектная і конкурсная дзейнасць, якая дазваляе палепшыць якасць абслугоўвання і прыцягнуць новых чытачоў. Важным напрамкам у рабоце бібліёбуса з'яўляецца правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў для розных груп чытачоў.

У намінацыі **«За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем»** на разгляд журы было прадстаўлена дзевяць работ.

Лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.І. Герцэна дзяржаўнай установы «Сетка публічных бібліятэк г. Гомеля» за стымуляванне дзіцячага чытання, павышэнне ўзроўню чытацкай культуры і папулярызацыю бібліятэкі праз рэалізацыю двух бібліятэчных праектаў – лабараторыі творчага чытання «Крок за крокам» і тэатра ценяў «Казкі святла і ценю». Асноўнай задумкай гэтых праектаў з'яўляецца папулярызацыя кнігі і развіццё чытацкага таленту дзіцяці, яго мовы і логікі, пазнавальнай актыўнасці пасродкам інавацыйных форм масавай работы. У выніку ў бібліятэкараў атрымалася зацікавіць юных чытачоў, адкрыць для бібліятэкі магчымасці новага супрацоўніцтва і партнёрства, і ў цэлым паспрыяць развіццю іміджу бібліятэкі сярод чытачоў і грамадскасці.

Першай прэміяй сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк журы адзначыла Гальшанскую сельскую бібліятэку дзяржаўнай установы культуры «Ашмянская раённая бібліятэка» Гродзенскай вобласці за далучэнне дзяцей, падлеткаў і моладзі да чытання і кнігі, а праз кнігу – да вытокаў нацыянальнай культуры і літаратуры. З 2017 г. бібліятэка паспяхова рэалізуе праект «Мы чытаем», які прадстаўляе комплекс напрамкаў і мерапрыемстваў па папулярызацыі твораў беларускай літаратуры, мовы, народных традыцый. Важную ролю ў выхаваўчым працэсе падрастаючага пакалення адыгрывае музей Дугі Струвэ ў бібліятэцы, які наведваюць як мясцовыя жыхары, так і турысты з іншых рэгіёнаў Беларусі і краін замежжа. Супрацоўнікамі распрацаваны аглядныя экскурсіі, падчас якіх турысты знаёмяцца не толькі з матэрыяламі, якія тычацца мерыдыяна і экспедыцыі Струвэ, але і з дзейнасцю бібліятэкі, Ашмянскім краі, яго гісторыяй і культурай.

Менш за ўсё работ было прадстаўлена ў намінацыі **«За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы»** – восем.

Лепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк адзначана Спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна». Сярод навацый бібліятэкі – шырокая праектная дзейнасць па ўсебаковым развіцці чытачоў з абмежаваннямі па здароўі, павышэнні іх інтэлектуальнага і культурнага ўзроўню: тыфлакраязнаўчы праект «Гродна: пачуць нябачнае» (2014–2015), праект па агучванні і выданні аўдыякніг гродзенскіх краязнаўцаў «Гродна: гісторыя ў гуку» (2017), праект па перакладу кніг па гісторыі Гродна сярод невідушчых людзей «Гісторыя на кончыках пальцаў» (2017–2018), праект па стварэнні тактыльных кніг для невідушчых дзяцей «Цёплыя кнігі» (2015–2017). У выніку рэалізацыі гэтых праектаў чытачы з парушэннямі зроку атрымалі магчымасць пачуць гісторыю роднага краю, а невідушчыя дзеці пагартаць і пачытаць пяць рукадзельных тактыльных кніг пазнавальнай і рэабілітацыйнай накіраванасці.

Вылучылася навацыямі ў галіне бібліятэчнай справы і заняла першае месца Цэнтральная раённая бібліятэка імя Я. Чачота дзяржаўнай установы культуры «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» Брэсцкай вобласці. У мэтах папулярызацыі кнігі і чытання, фарміравання ў соцыуме пазітыўнага іміджу бібліятэкі супрацоўнікі распрацоўваюць і ўкараняюць у практыку работы інавацыйныя формы і метады з выкарыстаннем камунікатыўных тэхналогій. Найбольш удалы ў галіне інавацыйнай дзейнасці бібліятэкі – праект «ИНФО.biblioteka//точки доступа». У межах праекта ажыццяўлялася PR-акцыя «Читающая остановка», стваралася ўласная відэапрадукцыя, якая затым прасоўвалася на канале навін дзяржаўнай установы культуры «Баранавіцкая раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» «БиблиоTV». Вынікам рэалізаванага праекта стаў рост папулярнасці бібліятэк сярод розных катэгорый насельніцтва, павелічэнне колькасці рэальных і віртуальных карыстальнікаў, публікацый у сродках масавай інфармацыі.

Якасны вынік праведзенага конкурсу – гэта пацвярджэнне выключнасці і індывідуальнасці кожнай бібліятэкі, высокага прафесійнага і творчага майстэрства спецыялістаў бібліятэк краіны. І сёння можна з упэўненасцю сказаць, што конкурс «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» будзе працягвацца і пашырацца, спрыяць больш якаснай рабоце бібліятэк, стымуляваць іх да рэалізацыі новых задумак і планаў, пошуку інавацыйных і цікавых сваім чытачам форм работы.

Summary

The results of the Republican competition «The Library as a Center of national culture».